# Калейдаскоп

снежань 2022

**Школьная газета №4 (44)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**снежань 2022**

**Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет. (Я. Колас)**

**Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю. (Я. Колас)**

**Ігнараваць мову — гэта значыць ігнараваць народ, нацыю. (П. Пестрак)**

**Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў. (Ф. Скарына)**

**Хто адрокся мовы бацькоў сваіх, хто ўдзеў чужую апратку — той адышоў ад народу далёка-далёка. Ён чужы ў роднай вёсцы, у сваёй сям'і. І на яго браты глядзяць як на чужынца. (Цётка)**

**Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова. (А. Крывіцкі)**

**Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў. (У. Караткевіч)**



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**снежань 2022**

Снежань, які “зямлю грудзіць, хаты студзіць, год канчае, зіму пачынае”, атрымаў назву ад слова “снег”. У выданнях Францыска Скарыны дванаццаты месяц згадваецца як «прасинец», у “Храналогіі” Андрэя Рымшы (1581) называецца «просинецъ». Назва, якая выкарыстоўваецца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, узнікла ў асяроддзі газеты “Наша ніва” і набыла канчатковую форму ў 1912 годзе, калі ў календары “Нашай нівы” былі пададзены прапанаваныя назвы месяцаў з тлумачэннямі. Паслядоўна ў гэтай газеце ўжываліся варыянты назвы: у 1907 годзе – грудзень, у 1908 годзе – грудзень (дзекабр), у 1909 годзе – снежань (дзекабр), у 1910—1912 гадах – снежань, у далейшым – толькі снежань.



Здавён у снежні асноўная праца сялян пераходзіла ў хату. Доўгімі зімовымі вечарамі гарэ-ла лучына. Мужчыны знаходзілі занятак, які быў звязаны з дробным рамяством, рамонтам. Жанчыны ж пасля сядзення за грэбенем ці прасніцаю браліся ткаць кросны.

У нашых продкаў добра быў развіты прагноз надвор’я. Народныя веды замацоўваліся ў такіх, напрыклад, прыкметах. Мароз у снежні і снег вышэй хаты – будзе год тады багаты. Сухі снежань – сухая вясна, сухое лета. Калі ў снежні вялікі іней, гурбы снегу, глыбока прамерзлая зямля – да ўраджаю. Прываліць у снежні ўшчыльную снег да платоў – дрэннае будзе лета, у адваротным выпадку – ураджайнае. Снежань снежны, халодны абяцае ўраджайнае жніво.

**Сказана як звязана**
Снежань замосціць і загвоздзіць.
Снежань сцюжны з зімою дружны.
Зіма снежная – лета дажджлівае.
Снежань вока снегам цешыць, ды марозам вуха рве.
У снежні адкрытае вуха – летам горача і суха.
Калі не будзе зімою бела, то не будзе ўлетку зелена.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**снежань 2022**

**4 снежня.** Увядзенне. Назву свята праваслаўнай царквы народ тлумачыў так: «Бог прыводзіць зіму на зямлю». Прадугледжвалася магчымае пацяпленне: «Уведзенне разбіваець ледзенне». .

**7 снежня**. Кацярына. Усё больш упэўнены наступ снежнай зімы адчуваўся з кожным днём: «Прыйшла Кацярына — прыйдзе і пярына».

**9 снежня**. Восенькі (ці зімовы) Юр’я. Пра яго гаварылі, што ён «грудай гвоздзіць». У народнай прыкмеце гаворыцца: «Колькі на асенняга Юр’я снегу, столькі на вясенняга — травы».

**13 снежня.** Андросы (Андрос, Андрэй, Андрэйкі). Дзявочае свята. Народная традыцыя амаль нічым не звязана з хрысціянскім праслаўленнем апостала Андрэя Першазванага. Гэта адзін з 12 вучняў Хрыста, брат апостала Пятра. Пасля зыходжання Святога Духа апостал Андрэй з Віфсаіды прапаведаваў у I стагоддзі Евангелле ў розных краінах, у тым ліку і на славянскіх землях. Празваны Першазваным таму, што першы быў прызваны Хрыстом на апостальскае служэнне.

**14 снежня**. Прарок Навум, сваім імем выклікаў адзіную асацыяцыю: «ум». Пра яго гаварылі так: «Навум розуму навучыць» або «Навум наставіць на вум». Таму і імкнуліся з гэтага дня вучыць грамаце дзяцей, спадзеючыся, што яны, дзякуючы Навуму, хутчэй і лепш засвояць навуку.

**17 снежня**. Варвара. Яе імя таксама вельмі красамоўна абыгрывалася народам. Галоўнае, што адзначаў селянін, гэта як ад Варвары паступова пачынае прыбываць дзень («на казіны скок»), такім чынам, былі ўсе падставы «папракнуць» яе за тое, што яна, Варвара, «ночы ўваравала, а дня прытачыла».

**18 снежня**. Сава (Саўка), як і Варвара, быў «бабскім» святам з тымі ж правіламі. Паколькі ён ішоў непасрэдна перад Міколам, то зваўся «Міколіным бацькам». Пра гэту «тройцу» гаварылі: «Барбара мосціць, Саўка цвякі вострыць, а Мікола прыбівае», маючы на ўвазе паступовае нарастанне маразоў. Калі на Саву надта дзьмуў вецер, такога ж ветру трэба было чакаць усю квадру пасля Пятра.

**19 снежня**. Мікола Зімовы. Багата адлюстраваны ў прымаўках: “Без Міколы не бывае ні зімы, ні лета”, “Хвалі зіму на Міколе”, “Да Міколы няма зімы ніколі”.

**22 снежня.** Ганны (Ганкі, Ганна). Гэты прыкметны ў годзе дзень (з астранамічнага пункту погляду — 21-22 снежня зяўляецца днём зімовага сонцастаяння) прысвечаны шанаванню праведнай Анны — маці Багародзіцы. Каталікі прысвячаюць гэтай падзей 26 ліпеня, дзень блізкі да летняга раўнадзенства.

**24 снежня**. Посная куцця. Пачатак Каляд (да 6 студзеня). Дзяўчаты варажылі, ці хутка выйдуць замуж. Насілі з песнямі “звязду”. Бытавалі прыказкі і прымаўкі звычайна тыя ж, што і ў праваслаўных: “Прыйшлі Калядкі, гаспадарам парадкі”, “Калядкі — добрыя святкі: бліны ды аладкі”, “На Каляды ясна — ясна й на Пятры”.

**25 снежня.** Раство каталіцкае (Каляды)

**30 снежня**. Дзень Сцяпана знамянальны тым, што заканчваўся тэрмін службы парабкаў. Чалавек, які ад Каляд і да Каляд працаваў на свайго гаспадара, мог адчуць сябе, нарэшце, больш-менш вольным: «На святы Сцяпан кажан парабак сабе пан!» Парабак дарабляў абгавораны тэрмін і спадзяваўся ў наступным годзе на больш выгадную дамоўленасць: «На святога Сцяпана найду другога пана».

# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**снежань 2022**

**Пагуляем у роднае слова**

Беларуская мова мнагагранная і самабытная, цікавая і арыгінальная. У гэтым зноў пераканаліся вучні **6 «А»** класа, для якіх 3 снежня быў арганізаваны **пазнавальны турнір «Пагуляем у роднае слова»**. Школьнікі падарожнічалі па станцыях і пашыралі свае веды пра беларускі фальклор і лексіку беларускай мовы,а таксама даведаліся шмат цікавых фактаў пра паходжанне слоў, паспрабавалі свае сілы ў пантаміме. Такія мерапрыемствы не толькі ствараюць умовы для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, але і фарміруюць уменне працаваць у камандзе і садзейнічаюць выхаванню патрыятычных пачуццяў.

**Пышнюк А.А., класны кіраўнік 6 «А» класа**











# Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
снежань 2022

**На пачатку дарог**

**7 снежня** ў актавай зале дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі **«Цэнтр творчасці «Эверэст» г.Магілёва»** адбылося святочнае ўзнагароджанне пераможцаў адкрытага конкурсу дзіцячай і юнацкай творчасці **«На пачатку дарог»**, **прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.**

У конкурсе прынялі актыўны ўдзел вучні нашай школы і занялі прызавыя месцы. Так вучань **6 «Г» класа Патненка Мацвей** атрымаў **дыплом 3 ступені** ў намінацыі «Мастацкае слова» ва ўзроставай катэгорыі 6-11 гадоў, кіраўнік Пышнюк А.А.

Вучні **5 «В» класа Кудзёлка Аліса, Падарожка Яраслаў і Самулёў Данііл** занялі ганаровае першае месца і атрымалі **дыплом 1 ступені** ў намінацыі «Тэатральная пастаноўка» ва ўзроставай катэгорыі 6-11 гадоў, кіраўнік Маргунова В.В.

Віншуем пераможцаў і жадаем дальнейшых поспехаў!

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры В.В.Маргунова**



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**снежань 2022**

**Гучы, роднае слова!**

**8 снежня** ў межах адзінага дня беларускага маўлення ў **6 «В»** класе адбыўся конкурс чытачоў **«Гучы, роднае слова!».** Падчас конкурсу ўдзельнікі выразна і пранікнёна чыталі вершы любімых паэтаў на роднай мове. Галоўнай мэтай мерапрыемства стала далучэнне дзяцей да чытання беларускай паэзіі, выхавання пачуцця любові да роднай мовы, да Радзімы.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т.М.**












# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**снежань 2022**

**Поры года. Каляндар традыцый**

**29 снежня** з мэтай папулярызацыі беларускай мовы **каманда «Славяне»** наведала этнаграфічны музей, дзе прайшоў пазнавальны тур гульні «Поры года. Каляндар традыцый». Дзеці пазнаёміліся з экапазіцыямі музея, даведаліся пра святкаванне Каляд у Беларусі, прынялі ўдзел у інтэлектуальнай гульні, звязанай з нацыянальнымі традыцыямі. У мерапрыемстве былі каманды з розных школ, і ўсе актыўна праявілі сябе падчас сустрэчы . Кожная каманда атрымала салодкія пачастункі.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С. А.**






# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**снежань 2022**

### “Прыказкі і прымаўкі”

**10 лістапада** ў межах папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры для вучняў **5 “А”** класа прайшло мерапрыемства **“Прыказкі і прымаўкі”**, накіраванае на пашырэнне ведаў пяцікласнікаў пра фальклор. Дзеці яшчэ раз узгадалі, у чым заключаецца адрозненне прыказкі ад прымаўкі, з захапленнем суадносілі пачатак прыказкі з яе канцоўкай. Пяцікласнікам вельмі спадабалася працаваць у парах. Такія мерапрыемствы не толькі пашыраюць кругагляд вучняў, але і спрыяюць развіццю памяці.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Гарэева В.М.**










# Юбілейныя даты






**Данута Бічэль-Загнетава** – беларуская паэтэса. Нарадзілася 3 снежня 1937 года (па іншай версіі – 1 студзеня 1938) у сялянскай сям'і ў в. Біскупцы Лідскага раёна Гродзенскай вобласці). Скончыла Навагрудскае педагагічнае вучылішча (1957), аддзяленне беларускай мовы, літаратуры і гісторыі Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы (1962). З 1962 года выкладала беларускую мову і літаратуру ў школах Гродна. Член Саюза Пісьменнікаў СССР (1964).

У друку выступае з 1958 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). У вершах, арганічна звязаных з народна-паэтычнай традыцыяй, апявае Радзіму, жыццё працаўнікоў вёскі, прыгажосць роднай зямлі. Аўтар зборнікаў паэзіі «Дзявочае сэрца» (1961), «Нёман ідзе» (1964), «Запалянкі» (1967), «Доля» (1972), «Ты — гэта ты» (1976), «Браткі» (1979), «Дзе ходзяць басанож» (1983), «Загасцінец» (1985), «Даўняе сонца» (1987), «А на Палессі» (1990), «Божа, мой Божа» (1992), «Нядзелька» (1998), «Снапок» (1999), «На белых аблоках сноў» (2002), «Стакроткі ў вяночак Божай Маці» (2004), «Нараджэнне Езуса Хрыста, нашага Збаўцы» (2005), «Ойча наш…» (2008), «Іду сцяжынаю да Бога» (2012), «Выбраныя творы» (2016), «Дайсці да Каложы»(2017). Напісала паэмы і кнігі вершаў для дзяцей «Перапёлка» (1968), «Грыб-парасон» (1969), «Дзічка» (1971), «Рыжая палянка» (1971), «Дагані на кані» (1973), «Лузанцы» (1982), «Габрынька і Габрусь» (1985), «Гараднічанка» (1993). Аўтар кнігі нарысаў, мемуараў і эсэ «Хадзі на мой голас» (Вроцлаў, 2008), выдала кнігі прозы «Мост святога Францішка» (2010), «Правінцыя святога Францішка» (2013). З 1982 па 1998 гады загадчыца Дома-музея Максіма Багдановіча ў Гродна. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы (1984) за зборнік вершаў «Дзе ходзяць басанож». Узнагароджана медалём. Займаецца грамадскай, літаратурнай, асветніцкай дзейнасцю.

# Юбілейныя даты






**Алесь Разанаў** нарадзіўся 5 снежня 1947 года ў вёсцы Сялец Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачых. Бацька, Сцяпан Разанаў (1910–1986), паходзіў з вёскі, прыехаў з геадэзічнай экспэдыцыяй у Беларусь, дзе і застала яго вайна. У 1942 схоплены фашыстамі і вывезены ў Нямеччыну, дзе працаваў на заводзе, знаходзіўся ў канцлагерах Заксенхаўзен і Маўтхаўзен, з якога ў 1945 вызвалены савецкай арміяй. Вярнуўся да сям'і на Брэстчыну і застаўся жыць у вёсцы Сялец. Маці, Надзея, працавала медсястрой, фэльчарам-акушэркай, пазней – у бальніцы ў вёсцы Сялец.

У 1955 А. Разанаў пайшоў у Сялецкую сярэднюю школу, якую скончыў у 1966 і паступіў на філфак БДУ. Адначасова з вучобай у 1967– 1968 працаваў ліцейшчыкам на Мінскім заводзе ацяпляльнага абсталявання. У 1969 перавёўся на філалагічны факультэт Брэсцкага педінстытута (скончыў у 1970). У 1970–1971 выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Кругельскай сярэдняй школе Камянецкага раёна.

У 1971–1972 служба ў Савецкай Арміі. З 1972 літсупрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва» і бюлетэня «Родная прырода». Член СП Беларусі з 1972года. З 1974 рэдактар, затым старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». З 1986 на творчай рабоце. Вучыўся ў славістычнай школе ў Чэхаславакіі (1988). З 1990 старшыня Беларускага рэспубліканскага фонду імя Рэрыхаў, з 1992 навуковы супрацоўнік Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны. Віцэ-прэзідэнт Беларускага Пэн-цэнтра. Сябра Рады СП Беларусі (з 1990). Узнагароджаны дыпломам ЮНЕСКА за ўдзел у міжнародным літаратурным конкурсе «Сустрэча двух сусветаў».

Першыя публікацыі А. Разанава з'явіліся ў 1961 у піянерскіх газетах. Аўтар зборнікаў паэзіі «Адраджэнне», «Назаўжды», «Каардынаты быцця», «Шлях – 360», «Вастрыё стралы», «У горадзе валадарыць Рагвалод» (Вершаказы і пункціры). Творчасць паэта сведчыць аб яго неардынарным мысленні і нетрадыцыйным вобразна-паэтычным самавыяўленні. Наватарскія жанравыя і рытміка-інтанацыйныя формы яго паэзіі вызначаюцца гуманістычным напаўненнем, багатым жыццёвым зместам. Паэзія А. Разанава патрабуе ўдумлівага і неаднаразовага прачытання, заўсёды адкрывае новыя абсягі творчай індывідуальнасці. Выступаў з артыкуламі па пытаннях сучаснага літаратурнага працэсу, а таксама ў жанры эсэістыкі. Вядомы як перакладчык. Яго творы перакладзены на англійскую, балгарскую, грузінскую, чувашскую, чэшскую, эстонскую мовы.

# Юбілейныя даты






**Алена Сямёнаўна Васілевіч** (22 снежня 1922, засценак Даманшчына, цяпер вёска Ліпнікі, Слуцкі раён, Мінская вобласць — 8 жніўня 2021, Мінск) — беларуская пісьменніца. Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1978). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за тэтралогію «Пачакай, затрымайся…».

Нарадзілася ў сям'і ляснога аб'ездчыка. Засталася без бацькоў на восьмым годзе жыцця. Выхоўвалася ў сваякоў. Скончыла літаратурны факультэт Рагачоўскага настаўніцкага інстытута ў 1941 годзе. У час Вялікай Айчыннай вайны працавала бібліятэкаркай у шпіталі, пісаркай страявой часці, загадчыцай бібліятэкі. У 1946 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала літкансультанткай у Курскім абласным выдавецтве (1946—1950). З 1950 г. — загадчыца аддзела культуры часопіса «Работніца і сялянка», а ў 1972—1980 гг. — загадчыца рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Мастацкая літаратура», у 1981—1983 гг. — загадчыца рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Юнацтва».

Першы мастацкі твор (аповесць «У прасторах жыцця») надрукавала ў 1947 г. (часопіс «Беларусь»). Выйшлі аповесць «Шляхі-дарогі» (1950), кніжкі апавяданняў «Блізкія знаёмыя» (1954), «Заўтра ў школу» (1956), «Сябры» (1958), «Апавяданні» (1959), «Падслухала сэрца» (1960), «Калінавая рукавічка» (1963), «Я з вамі» (1964), «Пісар страявой часці» (1969), «Адно імгненне» (1975), «Шурка Рэмзікаў» (1985), зборнік апавяданняў і аповесцей «Мыс Добрай Надзеі» (1977). На аўтабіяграфічным матэрыяле напісана тэтралогія «Пачакай, затрымайся…», якую склалі аповесці «Расці, Ганька» (1966), «Доля знойдзе цябе» (1968), «Новы свет» (1968), «Пачакай, затрымайся…» (1970). Аўтар кніг «Люблю, хвалююся, жыву» (нататкі, эсэ, 1986), «Элегія» (апавяданні, эцюды, эсэ, 1988).

Аўтар кніг для дзяцей «Заўтра ў школу» (1956), «Сябры» (1958), «Калінавая рукавічка» (1963) і інш. Пераклала на беларускую мову аповесць М. Стэльмаха «Гусі-лебедзі ляцяць» (1975), раман Д. Дэфо «Жыццё і дзіўныя прыгоды марахода Рабінзона Круза» (1976), аповесць Г. Башырава «Зялёная мая калыска» (1981) і інш.

Памерла 8 жніўня 2021 года.

# Юбілейныя даты






**Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў** (нар. 26 снежня 1937, в. Кругель, Палескае ваяводства, Польская Рэспубліка (цяпер Камянецкі раён, Брэсцкая вобласць, Беларусь) — беларускі літаратуразнаўца, крытык, пісьменнік. Доктар філалагічных навук (1987), прафесар (1991). Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь (2003; член-карэспандэнт — з 1994). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1972).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута (1959). Служыў у Савецкай Арміі (1959—1961). Працаваў завучам Тамашоўскага дзіцячага дома, настаўнікам Камароўскай сярэдняй школы Брэсцкага раёна.

У 1962—1969 гадах аспірант, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларускай ССР. У 1965 скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН БССР і быў залічаны навуковым супрацоўнікам гэтага ж інстытута. У 1965 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1969—1976 гадах — інструктар аддзела культуры, загадчык сектара мастацкай літаратуры ЦК КПБ. З 1976 года — намеснік дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларускай ССР па навуковай рабоце. З 1977 года адначасова загадчык аддзела Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларускай ССР. Член СП СССР з 1972. У 1987 годзе абараніў доктарскую дысертацыю. З 1998 года — дырэктар, з 2006 года — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З 2008 года — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі· Цяпер працуе галоўным рэдактарам выдавецтва «Галіяфы». У друку выступае як крытык і літаратуразнаўца з 1962 года. Вывучае гісторыю, тэорыю і метадалогію беларускай літаратуры і літаратурнай крытыкі XX стагоддзя. Падрыхтаваў 14 кандыдатаў навук. Выдаў брашуры «Лірычны летапіс часу» (1967), «Ленін у сэрцы» (1968), «Сучасная беларуская паэзія» (1969), «Пафас жыццесцвярджэння: Вобраз чалавека актыўнай жыццёвай пазіцыі ў сучаснай беларускай паэзіі» (1985). Аўтар манаграфій. Уваходзіць у склад Праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, уваходзіў у склад Грамадскага савета пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

# Літаратурная старонка



## Зімовая дарога

Шпарка коні імчацца у полі,
Сумна бомы гудзяць пад дугой,
Запяваюць аб долі і волі,
Напяваюць у сэрцы спакой.
Ўюцца змейкай срабрыстай дарожкі,
Брызгі золата ў небе блішчаць,
І маркотныя месяца рожкі
Праз марозную мглу зіхацяць.
Поле нікне у срэбным тумане,
Снег блішчыць, як халодная сталь,
І лятуць мае лёгкія сані,
Унашуся я ў сінюю даль.

**Максім Багдановіч**





Р
размалёўка
рамонак
Р
С
сунічкі
С
сцежка
слімак
С
скрыня
С

# Цікава ведаць

Калейдаскоп
снежань 2022






Рэдактар Юрчанка С.А.